Vrubleŭska biblioteka

Krynica

ŠALTINIS

VILNIA, 22-25 ŚNIEŽNIA 1939 HODU. №11 (708). Hod vydańnia XXI.

BIEŁARUSKAJA NARODNAJA HAZETA
Vychodzić u aŭtorki i piatnicy.

Cana numaru 10 cent. Padpiska na hod—5 lit., na paŭhoda 3 lity. Da kanca 1939 h. — 0.75
Adras red. i admin.: Vilnia, Zavalnaja vul. 1—2.

# NARADŽEŃNIE BOHA—ČAŁAVIEKA

Nadchodziać Kalady, Božaje Naradžeńnie. Z hetaj nahody mnoha toŭpicca ŭ dušy našaj dumak i zahadak, jakija čakajuć razhadki. A hetyja razhadki sapraŭdy znachodzim u kaladnym źmieście. Tut-ža idzie hutarka nia tolki ab naradžeńni na ziamli Boha-Čałavieka.

Čałaviek zaŭsiody šukaje Boha: i tady, kali praz vieru i luboŭ znachodzicca z im u zažyłaści, i tady, kali praz svaje błahija pastupki i niedavierstva jaho nienavidzie i z im borycca. Viečny niespakoj čałavieka, pastajannaje šukańnie ideałaŭ — heta jość šukańnie Boha, i baraćba z im u imia niečaha, byccam jašče lepšaha, — heta faktyčna toje-ž šukańnie Boha.

Siańnia vialiki zakałot na śviecie: usiudy nienaviść, biezahladnaja, navat kryvavaja baraćba. U kaladnym śviatle, u śviatle Naradzinaŭ Boha-Čałavieka ŭsia žudaść siańniašniaha na śviecie zakałotu jašče jarčej kidajecca nam u vočy. A hety zakałot—heta vynik adbožańnia sučasnaha kulturnaha čałavieka, abo vynik słužeńnia fałšyvym bahom. Z druhoha-ž boku, hety siańniašni zakałot źjaŭlajecca adnačasna i dokazam šukańnia Boha, bo-ž, jak bačym i čujem, badaj usie vajujučyja starony robiać heta ŭ imia vyšejšaj spraviadlivaści, u imia niečaha nadčałaviečaha, Božaha. Płaščom hetych ideałaŭ prykryvajucca navat i tyja, jakija jaŭna im piarečać. Heta znača, što patreba Boha dla čałavieka jość tak naturalnaj spravaj, što jaje nia moža pazbycca



i toj, chto pazbycca jaje žadaŭ-by.

Tak, ideja Boha—čałavieku nieabchodnaja. Jon tak ci jnakš Boha šukaje i imkniecca z im złučycca. Znajomyja, znača, dumki i pažadańni znachodzie čałaviek u kaladnym Boha-Čałaviečym źmieście. Hetaj-ža idei, moža časta navat niaśviedama, šukaje i starajecca realizavać sučasny čałaviek i ŭ siańniašnim hetym vialikim zakałocie. My ćviorda vierym, što ŭsie tyja błahija siły, jakija boracca, niščać sami siabie, a tady vyzvalajucca siły dobryja, siły śvietłyja, jakija źjaŭlajucca recham siły Boha-Čałavieka. My ćviorda vierym, što z hetaha siańniašniaha vialikaha i kryvavaha zakałotu narodzicca lepšy, śviatlejšy śviet, bo-ž hetaha faktyčna i šukaje ŭściaž duša čałavieka, choć-by jana navat časova błudziła. Boha-čałavieckija ideały ŭ dušy čałavieka ŭściaž damahajucca svaich pravoŭ i ŭściaž tak ci jnakš realizujucca. A realizacyjaj siańnia na śviecie henych ideałaŭ budzie supakoj narodaŭ na padstavach pašany ich jazyka, kultury, samastojnaści. Hetychža ideałaŭ prahnie, imi žyvie i da ich imkniecca takža i Biełaruski narod i, vierym, što ich zdabudzie i zajmie naležnaje sabie miesca siarod volnych i kulturnych na śviecie narodaŭ.

A zadatkam, parukaj hetaha jość ideja Boha-Čałavieka, realizacyju jakoj, jak padstavu žyćcia ludzkoha, znachodzim u kaladnym źmieście, jaki nam prypaminaje naradžeńnie na ziamli Boha - Čałavieka. Sprava-ž prydbańnia čałaviekam bolš Praŭdy, Boha, jość siańnia čałavieku spravaj jaho byćcia, spravaj jaho vychadu na jasny bierah z sučasnaha chaosu, kryvi i zakałotu. Biaz Boha niama sapraŭdnaha čałavieka. Voś čamu nam darahija Kalady, voś čamu nam luby ideał Boha-Čałaviečy, ideał zrealizavany ŭ Betlejemie blizu dźvie tysiačy hadoŭ tamu...

**A. S—ki**

*Kaladnija pryvitańni ŭsim svaim Čytačom, Padpiščykam, Supracoŭnikam i Prychilnikam pierasyłaje*

*Redakcyja i Administracyja*

*„K R Y N I C Y"*

# Ziamielnaja reforma ŭ Vilenščynie

Pa pryłučeńni Vilenščyny da Litvy adnym z pieršych zadańniaŭ uradavaj palityki stałasia praviadzieńnie tut ziamielnaj reformy tak, jak jana praviedziena ŭ reščie Litvy. Dziela taho, što ŭ Vilenščynie niama arhanizacyjaŭ, jakija pazvalali b utvaryć pavietavyja kamisii ziamielnaj reformy, a tak-ža dziela roznych tut miascovych varunkaŭ akazałasia patreba źmieny ahrarnaha zakonadaŭstva Prajekt takoj źmieny byŭ pryniaty ŭ litoŭskim Sojmie dnia 15 śniežnia sioł. Pavodle ŭradavaj zajavy, pryhatavaŭčyja pracy da ziamielnaj reformy pačnucca zaraz-ža, a sama reforma budzie pravodzicca ŭžo najbližejšaj viasnoj i ŭletku —Źjaŭlajecca ciapier pytańnie, jak pradstaŭlajecca ziamielny zapas i zapatrebavańnie na ziamlu na abšary hetaj-ža Vilenščyny?

Pavodle najnaviejšych statystyčnych padličeńniaŭ u vokruzie Vilenščyny jošć 3?3 ziamielnyja asiarodki (dvary), pryvatnyja i kazionnyja, ahulny abšar jakich 54.800 ha. Kolki z hetaha možna budzie rasparcelavać, zaleža ad taho, jakija vialikija buduć astavacca pa dvaroch reštki: 80 ha, jak było dahetul, ci tolki 50 ha. Kali była-b pakiniena norma ŭ 80 ha, dyk paŭstali-b 3.000 (try tysiačy) novych samavystarčalnych haspadarak.

Ab dahetulešnim charaktary ziamielnaj reformy ŭ Litvie varta viedać, što jana jšła i jdzie ŭ dvuch kirunkach: *chutaryzacyi* viosak i *parcelacyi* dvaroŭ, abšar jakich pieravyšaje ŭstanoŭlenuju normu (80 ha). I adno i druhoje kirujecca da sarhanizavańnia sialanskich haspadarak *samavystarčalnych*. Hetak zaprajektavanaja reforma ŭ Vilenščynie maje skončycca za try, najdaŭžej za piać hadoŭ. Chutaryzacyja ŭ Litvie darmovaja, h. zn. tyja, što pierachodziać na chutary, nia tolki ničo ha za heta nia płaciać, ale ŭ pieršym hodzie karystajuć jašče z pałohkaŭ padatkavych i dastajuć pomač matarjałam budaŭlanym. Drobnyja haspadarki dastajuć pryrezy, kab być samavystarčalnymi.

Z rasparcelavanych dvaroŭ dastavać ziamlu pieršynstva majuć: biezziamielnyja, parabki i arendatary. Pomač ahranamičnaja dla haspadarak biaspłatnaja; vykonvajuć jaje ahranomy Ziemlarobskaj Pałaty.

Ziamielnaja reforma abyjmaje nia tolki hrunty vornyja, ale tak-ža i abšary lasnyja, kali jany bolšyja jak 5 ha ŭ kožnaha haspadara. Pry hetym u lasnych haspadarkach z abšaram miž 5 i 80 ha ŭłady tolki pravodziać kantrol; zatoje lasnyja haspadarki z abšaram bolš 80 ha całkom pierachodziać na ŭłasnaść kazny.

Usie pryhatavańni da praviadzieńnia ziamielnaj reformy ŭ Vilenščynie i samuju reformu pravodzić budzie Akružnaja Ziamielnaja Uprava (Žemes Ukio Tvarkytojas) u Vilni, Vialikaja Pahulanka 24.

*A. K.*

# Uparadkavańnie vytvorčaści lonu ŭ Litvie

Adnej z važnych halin ziemlarobskaj dziejnaści źjaŭlajecca vytvorčaść lonu. Vytvorčaść lonu ŭ Litvie na adpaviednuju vyšyniu starajucca pastavić uradavyja kruhi. Nadoviačy hetu spravu pradstaŭlaŭ na arhanizacyjnym sabrańni lnianoj kooperatyvy ministar ziemlarobstva Audienas. Jon kazaŭ, što „raniej u Litvie zusim nia viedali navačasnaj ziemlarobskaj vytvorčaści. Tolki pa suś vietnaj vajnie ŭrad pry pomačy kooperacyi pačaŭ arhanizavać novyja haliny ziemlarobskaj haspadarki. Spačatku było zarhanizavana małačarstva, hadoŭla i vyrab bekonaŭ, vytvorčaść cukrovych burakoŭ i h. d. Vytvorčaść lonu praz hety čas była samatužnaj i dziela hetaha vielmi astavałasia z-zadu. Kali npr. małačarskich praduktaŭ, masła i syra, u 1923 hodzie vyviaźli zahranicu 899.700 kilohramaŭ, a ŭ 1938 h.—až 19,917.722, kali śviniej u 1923 h. vyviaźli 825 štuk, a ŭ 1938 h.—284 068 štuk, to lonu ŭ 1923 h. vyviaźli ŭsiaho 7.724.800 kilohramaŭ, a ŭ 1938 hodzie— 18.883.521 kilohramaŭ.

Kali našaja małačarskaja i miasnaja vytvorčaść pavysiła svaju jakaść i ŭ sučasnaści na zahraničnych rynkach, npr. u Anhlii, u konkurencyi zmahajecca za pieršaje miesca, to jakaść litoŭskaha lonu zajmaje amal apošniaje miesca. Pieršaha sortu lonu vytvarajem tolki 4—5%. Dyk siańnia haloŭnym zadańniem źjaŭlajecca — pavyšeńnie jakaści lonu. Rabota ŭ hetym napramku daručana novastvoranaj lnianoj kooperatyvie.

Sajuz lnianych kooperatyvaŭ arhanizavany na toje, kab pavysić jakaść lonu na vyvaz, kab palehčyć ziemlarobam jahonuju hadoŭlu i kab hetkim sposabam pavialičyć dachod ziemlaroba i ŭsiaho narodu.

Zadańniem novaj kooperatyvy „Linas" —tvaryć u rajonach, hdzie lon siejecca, fabryki, u jakija-b ziemlaroby dastaŭlali lon tolki vyrvany, a ŭsiej dalejšaj vyrabkaj lonu zanialisia-b fabryki.

Usie ziemlaroby buduć zmušany zarhanizavacca u kooperatyvy hadoŭli lonu i ŭsimi sposabami brać učaście u zakładańni fabryk dziela dalejšaj vyrabki lonu; takim sposabam buduć jany učaśnikami dachodaŭ, jakich časć raniej išła u karyść pasiarednikaŭ.

Supolnaj pracaj usich— kaža ministar — budzie jakaść lonu pastaŭlena na vyšyniu, jakuju asiahnuŭ lon Belhii, Holandyi i i inšych krain."—

— Ministerstva Ziemlarobstva rychtuje prajekt zakonu ŭ spravie vytvorčaści i vyrabki lonu. Pavodle prajektavanaha zakonu, usie, chto budzie zajmacca vytvorčaściu, a tak-ža vyrabkaj lonu, pavinny mieć na heta dazvoł ad Ministerstva Ziemlarobstva. Canu, pavodle jakoj u budučyni buduć ziemlarobam płacić za lon, ustanović Ministerstva Ziemlarobstva, u parazumieńni z Ministerstvam Finansaŭ. —

Jašče pryjmajucca kandydaty ŭva ŭsie klasy i addzieły

**Biełaruskaje Dziaržaŭnaje Prohimnazii**

(dasiulešniaja himnazija biaz liceju)

**i Biełaruskaje Dziaržaŭnaje Pačatkavaje Škoły.**

**Lekcyi ŭ prohimnazii i pačatk. škole adbyvajucca narmalna.**

*U prohimnaziju i pačatkavuju školu pryjmajucca vučni, jakija ciapier vučacca ci vučylisia ŭ polskich ci rasiejskich školach.*

**Pryjmo kandydataŭ u prohimnaziju i pačatkavuju školu adbyvajecca ŭ pamieškańni himnazii na Daminikanskaj vul. № 3-5, u hadzinach ad 8 da 12.**

# STATUT TAVARYSTVA „CENTR BIEŁARUSKAHA RUCHU ŭ Litvie"

## I. Nazoŭ, meta, srodki viadučyja da mety i pravy

§ 1. Nazoŭ T-va: „Centr Biełaruskaha Ruchu ŭ Litvie".

§ 2. Meta T-va: łučyć Biełarusaŭ Litvy, pašyrać siarod ich biełaruskuju nacyjanalnuju śviedamaść i kulturu, palepšać ekanamičnaje žyćcio i praŭnaje pałažeńnie, zdavolvać patreby Biełarusaŭ dabradziejnaj i sacyjalnaj pomačaj, staracca ab zbližeńnie Biełarusaŭ i Ličvinoŭ.

§ 3. Dziela asiahnieńnia svajej mety Tavarystva ŭstanaŭlaje sekcyi: krajovuju, litaratury, dramatyčnuju, muzyčnuju, mastackuju, spartovuju, ekanamičnuju i jurydyčnuju, zakładaje škoły, čytalni, naładžvaje kursy, pradstaŭleńni, źjezdy, kancerty, chory, viečaryny, ekskursii, kulturnyja zabavy, zbory achviaraŭ, fantavyja loteryi, zakładaje kasy samapomačy i kłapocicca ab navučańni litoŭskaj i biełaruskaj movy.

§ 4. Tavarystva jošć jurydyčnaj asobaj i maje prava: nabyvać majemaść, addavać u załoh i ŭsiakim sposabam pieradavać, dachodzić i adkazvać u sudzie, brać achviary i dapamohi, brać pazyki i pierakazvać testamentam, a adnak nabyć jakimniebudź sposabam nieruchomuju majemaść T-va moža tolki z dazvołu Ministra Unutranych Spraŭ.

## II. Sialiba i prastor dziejnaści

§ 5. Sialiba T-va — stalica Litvy.

§ 6. Prastor dziejnaści T-va — usia Litva.

## III. Pravy i abaviazki siabroŭ

§ 7. Siabry T-va byvajuć: sapraŭdnyja, pačesnyja i pryjacieli.

§ 8. Siabram T-va nia moža być toj, chto sudom pazbaŭleny prava, abo abvinavačany ŭ spravie, za jakuju pahražaje pazbaŭleńnie pravoŭ, abo pazbaŭleny pravoŭ asablivymi zakonami dziela abarony dziaržavy.

§ 9. Sapraŭdnymi siabrami mohuć być usie asoby — litoŭskija hramadzianie — mužčyny i žančyny, majučyja nia mienš 18 hadoŭ, adpaviadajučyja vymahańniam § 8 hetaha statutu. Sa zhody Ministra Unutr. Spraŭ siabram T-va moža być i niehramadzianin Litvy takoha-ž samaha vieku.

§ 10. Sapraŭdnyja siabry T-va majučyja nia mienš 21 hod majuć u T-vie prava rašajučaha hołasu i tolki hetkija majuć prava vybirać pavodle hetaha statutu ŭłady T-va. Siabry majučyja mienš jak 21 hod nia majuć u T-vie prava rašajučaha hołasu i nia mohuć vybirać uładuŭ T-va.

§ 11. Być vybranymi ŭ kiraŭnictva i inšyja pavodle hetaha statutu vybiranyja orhany T-va majuć prava tolki sapraŭdnyja siabry T-va, hramadzianie Litvy, jakija majuć nia mienš jak 24 hady, znajuć litoŭski jazyk u słovie i piśmie i adpaviadajuć vymahańniam § 8 hetaha statutu. Na padstavie zhody Ministra Unutranych Spraŭ uspomnienyja pravy mohuć być dany i niehramadzianam Litvy.

§ 12. Pačesnym siabram moža być vybranaja dastojnaja asoba, svajej pracaj abo jakoj inšaj dziejnaściaj zasłužyŭšaja davier biełaruskaha hramadzianstva. Da pačesnych siabroŭ tasujecca tak-ža § 8

# Ab supolnym Biełaruskim časapisu dla Litvy i Łatvii

Jak my daviedalisia, biełaruskaje hramadzianstva ŭ Ryzie rychtujecca da vydańnia z novaha 1940 hodu biełaruskaha štomiesiačnika ŭ Ryzie. U źviazku z hetym prajektam chočacca mnie zaprapanavać Biełarusam Łatvii i Litvy — abjadnać svaje srodki i siły dy vydavać adzin **supolny** časapis. Jašče hod nazad hetkaja prapazycyja moža i nia była-b asabliva cikavaj dla vilenčukoŭ, bo ŭ Vilni biełaruskaje hramadzianstva, nia hledziačy na polski režym, adčuvała siabie davoli mocna dy aproč taho mieła zusim inšyja nacyjanalnyja mety i zadačy ŭ svajej pracy. Ciapier sytuacyja hruntoŭna źmianiłasia i stanovišča Biełarusaŭ u Vilni zrabiłasia hetkim-ža, jak i ŭ Ryzie: Biełarusy Vilenščyny stalisia nacyjanalnaju mienšaściu adnaje z dziaržaŭ Prybałtyki.

Jašče sioleta ŭletku biełaruskija hramadzkija dziejačy ŭ Vilni adčuvali siabie kirujučym aktyvam troch z pałavinaj milonaŭ biełaruskaha masyvu Zachodniaje Biełarusi. Jaki-b ciažki stan pracy nie stvaraŭsia ŭ Vilenščynie, biełaruskaje hramadzianstva ličyła siabie nie „nacyjanalnaju mienšaściu", ale **haspadarami** kraju (praŭda, zaniataha Palakami), viadučymi zmahańnie i majučymi nadzieju zdabyć svaju dziaržaŭnaść. Vilenčuki mieli zadačy nia tolki nacyjanalna-kulturnyja i ekanamičnyja, ale i palityčnyja. Ciapier palityčnyja zadačy adpali. Vilenskaja kirujučaja hałoŭka adciata ad zachodnia-biełaruskaha tułava i pavinna abmiežavacca nacyjanalna-mienšaściovaju biełaruskaju pracaju ŭ miežach Litoŭskaje respubliki.

Jakaja-ž praca mahčyma i patrebna ciapier u Vilenščynie? — Praca heta nie małaja i nadzvyčajna važnaja:

1. nacyjanalnaje samaŭśviedamleńnie i zachavańnie biełaruskaje mienšaści ad asymilavańnia inšymi narodnaściami;

2. kulturna-aśvietnaja praca, jak na hruncie školnym, tak i hramadzkim: chory, teatr, lekcyi, viečaryny, vydaviectva, na vukovaja i litaraturnaja;

3. ekanamičnaje zamacavańnie biełaruskaje mienšaści: kooperatyŭny ruch, ramieśnickija škoły i hurtki, arhanizacyja kredytu dla handlu i vioski, małačarni i t-vy dla supolnaha karystańnia sielska haspadarčymi mašynami.

Voś-ža hetkija samyja zadačy stajać i pierad biełaruskaju mienšaściu ŭ Łatvii i pierad biełaruskaju mienšaściu ŭ Litvie, a taksama i jašče pierad adnej biełaruskaju mienšaściovaju hrupaju, ab jakoj my zusim zabylisia ŭ našym adradženskim ruchu,—pierad biełaruskaju mienšaściu ŭ Izborska-Piačorskim kraju ŭ Estonii.

Adnymi vilenskimi biełaruskimi srodkami vydavać ciapier biełaruski pavažny časapis budzie ciažkavata: i litaraturnyja siły źmienšylisia z vyjezdam z Vilni šerahu biełaruskich piśmieńnikaŭ i navukoŭcaŭ, dy i z matarjalnaha boku buduć zatrymki. Toje-ž treba skazać i ab biełaruskim hramadzianstvie Łatvii. Tutaka ŭžo 20 hod robiacca sproby naładzić stałaje vydaviectva biełaruskaha časapisu, ale niastača srodkaŭ spyniaje pracu. Niekatoryja časapisy vyjšli ŭsiaho adnym numaram, jak „Na čužynie" ŭ 1920 hodzie, „Pahonia" ŭ 1930 hodzie, „Žyćcio i praca" ŭ 1932 hodzie. Najbolš rehularna vychodzili vydavanyja K. Jezavitavym: miesiačnik „Łastaŭka" ŭ Lucynie z 1923 pa 1924 h. vyjšaŭ 9 razoŭ, hazeta „Hołas Biełarusa" z 1925 pa 1929 hod vyjšła 61 raz i časapis „Biełaruskaja Škoła ŭ Łatvii" z 1926 pa 1934 vypuściŭ 25 numaroŭ.

Pryjmajučy pad uvahu, što matarjalny stan biełaruskaha hramadzianstva ŭ Łatvii nie palepšyŭsia, a značna pahoršyŭsia, možna praduhledzić, što novy štomiesiačnik taksama nia vytrymaje doŭha. Tamu było-b karyśniej Biełarusam Łatvii dahutarycca z Vilenčukami i vydavać adzin štomiesiačnik. Ryha, Dźvinsk, Vilnia i Kaŭnas daduć i naležnuju ličbu padpiščykaŭ i supracoŭnikaŭ, zrazumieła, pry varunku, što hetki ahulny časapis budzie sroha abjektyŭnym, biezpartyjnym i apalityčnym.

Čytač

**Ad Redakcyi:** Žmiaščajučy hety vielmi cikavy i cenny hołas ličym svaim abaviazkam dadać tut ad siabie prośbu i zaklik dalej vykazacca ŭ hetaj važnaj spravie. Hołas sabie redakcyja „Krynicy" pakidaje na paźniej.

NATALLA ARSIEŃNIEVA

* * *

*Rańnie ŭ mialicy mnie tumany:*
*Asypajecca śnieham kastryca.*
*Na zrudziełych niŭ'joŭ dyvany,*
*Pa darozie pramierzłaj kurycca..*
*I saŭsim mnie, saŭsim nie škada*
*Załatoha vasieńniaha pyłu.*
*Čyrvań klonaŭ mahła-b ja pradać,*
*Biel abłokaŭ vasieńnich razmyłć.*
*Bo siahońnia što-ž varta krasa*
*Z usiaho paźbiranaja kraju,*
*Kali treba dušu abviazać*
*Vostraj zrebnaju nitkaj adčaju?*
*Rańnie ŭ mialicy mnie tumany:*
*Asypajecca śnieham kastryca...*
*Razvarušany hułam vajny*
*Choča ściśycca śviet i ukrycca...*

Usiakuju biełaruskuju knižku,
BIEŁARUSKI KALENDAR,
BIEŁARUSKIJA PAŠTOŬKI,
hazetu najtaniej i najchutčej dastaniecie ŭ biełaruskaj

**kniharni „Pahonia"**

Vilnia, Zavalnaja vulica № 1.
VILNIUS, Zavalinė g-vė 1.

*Kataloh biełaruskich knižak, na žadańnie, vysyłajecca darma.*

hetaha statutu i zakony ab T-vach („Vyr. Žin." Nr. 522, §§ 14, 15 i 16). Pačesnych siabroŭ vybiraje ahulny schod siabroŭ zvyčajnaj bolšaściaj hałasoŭ. Pačesnyja siabry zvalniajucca ad usiakich apłataŭ.

§ 13. Pryjacielam moža być kožny hramadzianin Litvy, jaki adpaviadaje § 8 hetaha statutu i maje nia mienš 18 hadoŭ. Na padstavie zhody Ministra Unutr. Spraŭ pryjacielami T-va mohuć być i niehramadzianie Litvy ŭ hetkich-ža hadoch.

§ 14. Pačesnyja siabry i pryjacieli T-va ŭ kiraŭnictva i ŭ inšyja vybiranyja orhany nia vybirajuć i sami nia mohuć być vybranymi. Na ahulnych sabrańniach jany biaruć učaście z pravam daradčaha hołasu.

§ 15. Sapraŭdnyja siabry T-va płaciać miesiačnuju składku, vyšyniu jakoj ustanaŭlajuć sami, ale nia mienš, jak 6 litaŭ u hod.

§ 16. Siabry T-va nia majuć pravoŭ da majemaści T-va i nie adkazvajuć za jahonyja daŭhi.

## IV. Pryjmo siabroŭ, vydaleńnie i vystupleńnie

§ 17. Asoby, žadajučyja ŭstupić u Tavarystva, padajuć prośbu Upravie, jakaja razhladaje jaje i robić adpaviednyja pastanovy. Pastanova Upravy ab niapryniaćci kaho-niebudź u siabry moža być zaskaržana Ahulnamu Schodu, rašeńnie jakoha jość akančalnym.

§ 18. Siabry, jakija svaimi pastupkami panižajuć imia T-va, svajej pracaj škodziać T-vu abo nie vypaŭniajuć statutu T-va, mohuć być vykłučany z siabroŭ T-va.

§ 19. Siabry ŭ naležnym časie nie zapłaciŭšyja siabroŭskich składak mohuć być z T-va vykłučany.

§ 20. Siabra T-va pierastaje być siabram: kali padaść Upravie zajavu na piśmie, što vystupaje z jaho; kali Ahulny Schod bolšaściu 2/3 hałasoŭ dziela vyšejuspomnienych abo inšych pryčyn takoha siabru z T-va vyčyrkivaje.

§ 21. Sprava siabra T-va, jaki pierastaŭ adkazvać vymahańniam § 8 hetaha statutu, pavinna być pradstaŭlena Ahulnamu Schodu, jaki paćviardžaje ŭspomnienaje pytańnie i takoha siabru vyčyrkivaje z siabraŭ T-va.

## V. Kiraŭnictva Tavarystva i sposab kiravańnia

§ 22. Tavarystvam kirujuć: Ahulny Schod siabroŭ, Uprava i Revizyjnaja Kamisija.

§ 23. Da kompetencyi Ahulnaha Schodu siabroŭ naležać: a) vybary Upravy i Revizyjnaj Kamisii, b) pryniaćcie hadavoj spravazdačy, a tak-ža paćvierdžańnie preliminara prychodaŭ i raschodaŭ, c) apracavańnie planu pracy, d) absudžeńnie i vyrašeńnie skarhaŭ siabroŭ, e) vydaleńnie siabroŭ, f) nabyvańnie niaruchomaj majemaści, pieradača jaje i źmiena, g) dapaŭnieńnie i źmiena statutu, h) likvidacyja Tavarystva, i) zakładańnie addziełaŭ i kiravańnie imi.

§ 24. Ahulnyja Schody byvajuć zvyčajnyja i nadzvyčajnyja.

§ 25. Zvyčajny Ahulny Schod sklikaje Uprava štohod nie paźniej studnia miesiaca dziela hadavoj spravazdačy, dziela pryniaćcia preliminara i dziela absudžeńnia inšych spraŭ vymahanych § 23 hetaha statutu.

§ 26. Paviestku dnia zvyčajnaha Ahulnaha Schodu ŭstanaŭlaje Uprava. U paviestku majuć być upisany i pytańni padanyja na piśmie paasobnymi siabrami, kali jany ŭručany Upravie prynamsia za

## Нашто сьпяшацца з выбарамі?

*(Думкі праваслаўнага Беларуса-міраніна)*

Духоўная ўлада прыняла праект арганізацыі царкоўнага жыцьця ў Віленшчыне. Паводле гэнага праекту ўжо ў хуткім часе ў прыходах маюць быць выбраны прыходзкія рады, якія выбяруць *раду Віленскага благочынія.*

Віленшчына за апошні час шмат перажыла і гэта адбілася і на псыхіцы жыхараў. Народ, калі можна так сказаць, адстаў ад царкоўных справаў. Жыцьцё высунула рад новых пастулятаў сацыяльнага і палітычнага зьместу і людзі не пасьпелі яшчэ разабрацца ў іх. Трэба, каб жыцьцё ўвайшло ў норму, а на гэта патрэбны час. Гэны час духавенства павінна выкарыстаць на падгатоўку вернікаў да арганізацыі прыходзкага жыцьця, зацікавіць іх царкоўнымі справамі і памалу арганізаваць гэнае жыцьцё.

Але для гэнае работы патрэбныя ідэёвыя людзі, якія-б любілі сваю паству, зжыліся з ёю і былі-б ёй блізкія.

Нажаль, такіх духоўнікаў мала. Трэба зазначыць, што ў Віленшчыне праваслаўныя— гэта Беларусы, а захапіць душу Беларуса можа толькі сьвяшчэньнік-Беларус, а такіх амаль-што няма. Яны асталіся із сваім народам на тэрыторыі Заходняй Беларусі, а кадры бежанцаў-сьвяшчэньнікаў у Вільні гэта Расейцы, якія паўцякалі ад сваіх пасомых, бо ведалі, што іх чакала, калі-б яны асталіся на месцы. І цяпер духоўная ўлада на беларускія прыходы вызначае сьвяшчэньнікаў, „сваіх людзей“, якія ніякага ўплыву на вернікаў мець ня будуць, вернікі будуць іх чурацца, а тым самым і Царквы. Гэныя духоўнікі змушаны будуць абапёрціся на невялічкія жменькі Расейцаў, раськіданых па прыходах, і, ясна, што пры байкоце з боку беларускіх масаў, калі выбары ўсё-ж-такі адбудуцца, пройдуць выключна Расейцы. Можа з гэнаю мэтаю духоўная ўлада і сьпяшыць з „выбарамі“?

Але ці-ж гэта будуць сапраўды выбары? Ніколі!

Тое, што мы пісалі, больш адносіцца да правінцыі. У самой Вільні справы стаяць яшчэ горш. У Вільні мы маем толькі два тэрыторыяльныя прыходы, якія маюць асновы прыходзкае арганізацыі: гэта Раманаўская Царква і Зьвярынецкая. У районах гэтых прыходаў жыве большасьць Расейцаў і там можна знайсьці пару дзесяткаў асоб, якія цікавяцца царкоўнымі справамі. Рэшта цэркваў de facto бязпрыходныя, але за тое абсаджаны „своими людьми“.

Такім чынам, выбары ў Вільні могуць прайсьці толькі пры пэўных падтасоўках, дзе харысты, царкоўныя сторажы і старасты, ды некалькі старушак будуць выбіраць раней намечаных а. а. настаяцелямі кандыдатаў.

Словам, выбары праведзеныя ў сучасны мамэнт, а тымбольш пасьля давольных ператасовак на мясцох настаяцеляў, справы ні колькі не паправяць і сапраўднага аблічча Царквы ані ейных патрэбаў не прадставяць. Замест гэтага адказныя за Царкву чыньнікі павінны былі-б больш паклапаціцца аб увядзеньні ў Царкву зьместу чыста рэлігійнага і выгнаць стуль чужацкую шкодную палітыку.

*Міранін.*

## Ноч мінула

*Ноч мінула. Паўцякалі...*
*І з зямлі прапалі цені,*
*Што страхоцьцямі стаялі*
*Ўсім на жудасьць, на смучэньне.*

*Ноч мінула. Разыйшліся*
*Й распаўзьліся зь неба хмары,*
*Што патворамі таўкліся*
*І віселі, як-бы мары.*

*Цені, хмары—ўсё прапала*
*І зара пусьціла косы:*
*Агняцьветам цалавала*
*Праясьнеўшыя нябёсы.*

*Гэй! Хто сьпіць яшчэ,— ўставайце!*
*Борзда, жвава, як да бою,*
*Сонца яснае вітайце:*
*Зара ўзыйдзе над зямлёю!*

*Ўлад-Ініцкі*

**Беларусы ў Мітрапаліта.** 12 сьнежня дэлегацыя прадстаўнікоў праваслаўных Беларусаў культурна-грамадзкіх арганізацыяў, злучаных у Беларускім Цэнтры ў Літве, зложыла Мітрапаліту Элеўфэрыю мэмарыял, у якім прадставіла рад беларускіх пастулятаў.

**а. Ал. Коўш,** настаяцель Мікалаеўскае Царквы ў Вільні, пастановаю мясцовае духоўнае ўлады звольнены з свайго становішча і залічаны ў „заштат“. На яго месца вызначаны а. Л. Голад. Устрымліваючыся тымчасам тут ад дальшых паясьненьняў, мусім зазначыць, што гэта замена азначае круты паварот у кірунку дальшага русыфікаваньня ў нас праваслаўнай цэрквы.

**Зрачэньне Мітрапаліта Дзяніса.** З добра паінфармаваных крыніц даведваемся, што Мітрапаліт праваслаўнай аўтокефальнай царквы ў б. Польшчы Дзяніс, па ўпадку Польшчы, зрокся свайго становішча на карысьць Бэрлінскага архіепіскапа Серафіма.

## Pierasialeńnie Niemcaŭ z Prybałtyki

Z Estonii ŭžo vyjechała 15.000, a z Łatvii kala 50.000 Niemcaŭ. Bolšaść jechać nie chacieła i adjaždžajučy płakała, bo nikoli nia bačyła Niamieččyny i viedaje, što pryjdziecca asialicca ŭ Paznanščynie, u Kališčynie, Torunščynie dy inšych ziemlach, adabranych ad Kašubaŭ i Palakoŭ, a znača apynucca ŭ roli asadnikaŭ, jakija pavinny buduć zamacavać ŭ hetych čužych ziemlach niamieckuju pieravahu. Niekatoryja pastanavili nia jechać, asabliva tyja, chto nie spačuvaje nacyjanał-socyjalistam. Ale takim pryjšłosia vytrymać vialikuju baraćbu z svajmi znajomymi, a navat i z chatnimi. Šmat siamiejak raźbiłasia: maci, abo baćka vyjechali, častka dziaciej pajechała ŭ Niamieččynu, a častka astałasia.

U Ryzie, pry adychodzie parachodaŭ, moładź uśmichajecca, a pažyłoje pakaleńnie płača i śpiavaje łatvijski nacyjanalny himn. U Estonii astaniecca kala 2.000 Niemcaŭ, a ŭ Łatvii značna bolš, mahčyma, što kala 5.000—7 000 čałaviek.

Adjezd Niemcaŭ, z adnaho boku, źjaŭlajecca dla Łatvii i Estonii duža pažadanym, bo zakančvaje sproby Niemcaŭ padparadkavać pad svaju ŭładu hetyja krainy, ale, z druhoha boku, taki raptoŭny vyjezd utrudniaje haspadarčyja pytańni. Estam i Łatyšom prychodzicca ciapier vypłacić Niemcam ahramadnyja sumy za fabryki, zavody, ziamielnyja haspadarki i budynki ŭ haradoch, dzie Niemcy mieli duža vialikija bahaćci. Vykup hetych majemaściaŭ budzie rasterminavany ŭ Łatvii na 10 hod, i dla ździejśnieńnia hetaje finansavaje operacyi stvorana asobnaje niamieckaje t-va „Utah“ jakoje i pryjmaje majemaść adjaždžajučych Niemcaŭ.

---

miesiac da dnia schodu i kali Uprava pryznaje pytańni važnymi.

§ 27. Nadzvyčajny Schod sklikaje Uprava: kali zdarajecca važnaja patreba, kali patrabuje hetaha Revizyjnaja Kamisija, abo kali hetaha damahajecca 1/10 časć siabroŭ T-va. Nadzvyčajny Schod maje być sklikany nie paźniej, jak za miesiac ad času ŭručeńnia hetaha damahańnia. U damahańni majuć być pakazany pytańni, jakija majuć być na Schodzie razvažanyja. Nadzvyčajny Schod razvažaje tolki tyja pytańni, dziela jakich jon sklikany.

§ 28. Ab sklikańni zvyčajnych i nadzvyčajnych schodaŭ siabry paviedamlajucca za dva tydni abviestkami ŭ presie abo asobnymi paviestkami.

§ 29. Ahulny Schod jość pravamocny, kali ŭ im biare ŭdzieł nia mienš, jak tracina siabroŭ Tavarystva. Kali-ž taki lik nie źbiarecca, sklikajecce druhi schod, katory jość pravamocny biaz uvahi na lik sabraŭšychsia siabroŭ. Nastupny schod moža być i taho samaha dnia, ale nie paźniej, jak za dva tydni, i ab hetym maje być zaznačana ŭ pieršym paviedamleńni ab schodzie.

§ 30. Na Ahulnym Schodzie siabroŭ hałasujecca adkryta, kali tajnaha hałasavańnia nie zažadaje 1/10 prysutnych na schodzie. Uprava i Revizyjnaja Kamisija vybirajecca tajnym hałasavańniem. Svaje pastanovy Ahulny Schod pryjmaje zvyčajnaj bolšaściaj hałasoŭ, za vyniatkam pastanoŭ u spravach praduhledžanych § 23 hetaha statutu, pp.: e, g, h.; pry roŭnym padziele hałasoŭ pieravažaje hołas staršyni Schodu.

§ 31. Ahulny Schod adčyniaje staršynia Upravy, ci jaho zastupnik i pieradaje vieści jaho prezydyjumu, vybranamu Ahulnym Schodam.

§ 32. U Upravu vybirajecca nia mienš, jak piać asob — siabroŭ i dvuch kandydataŭ, na adzin hod. Siabrami Upravy mohuć być hramadzianie Litvy, nie maładziejšyja jak 24 hady, znajučyja na piśmie i ŭ słovie litoŭski jazyk i adkazvajučyja ŭsim vymahańniam §§ 8 i 11 hetaha statutu. Uprava spasiarod siabie vybiraje staršyniu i vice-staršyniu i dzielicca funkcyjami.

§ 33. Pasiedžańni Upravy sklikaje staršynia Upravy abo, kali jon niaprysutny, zastupnik staršyni. Pasiedžańnie Upravy jość pravamocnym, kali na im prysutnyja nia mienš jak try siabry. Kali niama zastupnika staršyni, dyk pasiedžańnie moža sklikać siabra Upravy.

§ 34. Pastanovy Upravy pryjmajucca zvyčajnaj bolšaściaj hałasoŭ. Pry roŭnym padziele hałasoŭ pieravažaje hołas staršyni abo taho, chto staršynstvuje.

§ 35. Uprava maje prava prasić być prysutnym na svaim pasiedžańni kompetentnuju asobu z pravam daradčaha hołasu.

§ 36. Usiu karespandencyju imiem Tavarystva padpisvaje staršynia Upravy ci jaho zastupnik i sekratar Upravy. Usiakaha rodu dahavory, pryračeńni, kantrakty i paŭnamoctvy, roblenyja i vydavanyja imiem Tavarystva, majuć być padpisany staršynioj Tavarystva i adnym siabram Upravy.

§ 37. Uprava reprezentuje Tavarystva pierad uładami, hramadzkimi i pryvatnymi ŭstanovami, paradkuje spravy Tavarystva, daje notarjalnyja roŭnamoctvy inšym vykonvać i spaŭniać patrebnyja akty imiem Tavarystva, vykonvaje pastanovy siabroŭ Ahulnaha Schodu, źbiraje achviary, pryjmaje siabroŭ, robić hadavyja i inšyja preliminary, hrašovuju spravazdaču i śpisak siabroŭ, najmaje i zvalniaje słu-

# Adviedziny ŭ biełaruskich školach u Vilni

Nia hledziačy na toje, što Biełaruskaja Dziaržaŭnaja Prohimnazija i Biełaruskaja Dziaržaŭnaja Pačatkavaja Škoła ŭ Vilni znachodziacca ŭ centry miesta, pry Daminikanskaj vul. Nr. 3/5, adnak da ich nia lohka trapić. Pakul-što nia majuć jany ani svaich šyldaŭ, ani jakich-niebudź infarmacyjnych tabličak ci kartačak. Usio-ž šukajem henych škoł i znachodzim, daloka ŭ panadvorku, až na druhim paviersie. Idučy pa kamiennych schodach školnaha budynku, ahladajučy raźviešanyja na ścienach roznyja źnimki, abrazki historyčnych pamiatak, čuvać było pryhožuju melodyju biełaruskaje narodnaje pieśni: „Ci śviet, ci śvitaje"... Pierastupiŭšy paroh pamieškańnia himnazii śpieŭ možna było jašče lepš słuchać. Ale voś na kalidory spatykaju hramadzianina Uładysłava, katory hladzić tut za paradkam.

— Što — pytaju — u Vas sianńnia tut kancert, što tak pryhoža śpiavajuć?

— Dy nie! — adkazvaje — heta tolki lekcyja śpievu ŭ prohimnazii, jakuju viadzie praf. Jegier.

— Chaciełasia-b, viedajecie, pahladzieć, jak heta vyhladajuć našyja biełaruskija škoły, vučyciali, a pierad usim našu moładź i henych najmienšych dzietak z pieršych addziełaŭ. — Hetak pamaleńku prabuju ŭvajści ŭ kantakt z hram. Uładysłavam.

— Hm! — kaža jon mnie. — Treba źviarnucca da dyrektara a. Adama Stankieviča. Ale-ž jon nadta času nia maje. Tut zaŭsiody pośna da jaho roznych interesantaŭ prychodzić, a da taho musić viaści i prohimnaziju i pačatk. školu, i lekcyi, — i kancelaryju sam viadzie, bo sakratara niama, tak što jak pryjdzie pierad vośmaj hadzinaj ranicaj, tak praz uvieś čas ani chvilinki nia maje volnaje, — dyk nia viedaju, jak heta budzie z Vami.

Pačuŭšy, što maje adviedziny vypali ŭ nia nadta dobry čas i nia majučy peŭnaści, kab što-niebudź dy z ich vyjšła, ja prosta pušciŭsia na chitryki, kab dastać viestki nieaficyjalna, i davaj pamaleńku raspytvać, što čuvać ahułam, a paśla i... ab školach...

— A skažycie, kali łaska, jak mnoha dziaciej u prohimnazii i pačatkavaj škole?

— Dyk čujecie, jak piajuć, što až ścieny dryžać, a skrypku prafesara ledź tolki čuvać i małyja taksama časta śpiavajuć. A zaraz pieraryŭ, dyk pahladzicio,— poŭnyja kalidory buduć, i z kožnym dniom lik usio pavialičajecca.

— A što tam u nastupnaj zali? Tam čuvać niejki homan.

— Tam? Padyjdziem bližej, pasłuchajem. — Tut — pacichieńku raskazvaŭ Uładysłaŭ — paciecha našych vučycialoŭ, a maja biada. Heta samyja najmienšyja. Ciapier u ich arytmetyka. Vučyć ich hetaha praf. Karniuk. Jon dasiul byŭ u Vilenskim Universytecie asystentam. Dalej, u nastupnaj klasie, ciapier historyja. Tam viadzie lekcyju byŭšy dyrektar M. Ancukievič. Z henymi małyšami, prosta, biada,—varočaŭsia iznoŭ da ich Uładysłaŭ,—nadta kala ich mnoha raboty. Ja ich raspranaju, apranaju, a jany tut paśla lekcyi skačuć, biehajuć, kryčać i vučyciali z hetaha ciešacca, bo, kažuć, heta žyvaja, zdarovaja moładź. A kab vy pabačyli, što tut robicca, jak im ješci dajuć!

— Ach, tak, dajuć ješci!—pieraryvaju. — A kali heta byvaje?

— A voś zaraz. Užo pryhataŭlajuć harbatu, chleb, šmelc, kaŭbasy. Robiać heta vučycielki, hramadzianki A. Lekant-Sakałova i Novičycha.

Idziom tady da ich. U nievialikim pakoi stoł byŭ užo zastaŭleny kubkami i założany chlebam z kaŭbasoj i šmelcam. Naviazvaju hutarku. Až tut raptam zvanok, paśla čaho na kalidory było, jak u murašniku. Pry stale-ž mamentalna stvaryłasia kalejka, ale vučycielki chucieńka i sprytna jaje likvidavali i za chvilinku viasiołaja maładaja hramada padkarmlivałasia, kab mieć bolš siły dalej vučycca, kab mieć siły iści ŭ haru, i, jak kažaŭ paet, siahać pa sonca. Hledziačy na heny miły abrazok, šukaju dalej viestak.

— Skul-ža heta pomač i ci ŭsim dzieciam dajecca śniedańnie, dy ci kožny dzień?

— Pomač, — kažuć mnie — častkova mieli z Biełaruskaha Centru, a častkova z roznych dabravolnych achviaraŭ. Padkarmlivajucca badaj usie dzieci, nijakija vyniatki nia robiacca. Ale dzieci niekatorych zamažniejšych baćkoŭ prynosiać ježu z saboj, a biadniejšyja jaduć kolki chočuć. Jak mała adnaho kavałka chleba i kubka harbaty, dyk dajem im druhi. Niekatoryja dzieci vielmi biednyja i heta im vialikaje padtrymańnie. Pahladzicie, kolki hetaje skromnaje śniedańnie daje im radaści, a jakija ŭ ich apetyty! Jaduć adno pierad druhim, a vočki ŭ ich až harać. I dzieła taho ajciec Dyrektar i vučyciali pastanavili padkarmlivać dziaciej navat i praz uvieś čas śviatočnych feryjaŭ. I tak, choć lekcyjaŭ nia budzie, to adnak śniedańni buduć kožny dzień i dzieci buduć mahčy prychodzić u školu, padješci, a paśla buduć arhanizavacca dla ich roznyja hulni. Na katalickija Kalady, 24 śniežnia, arhanizujem jołačku i pryhataŭlajem dzieciam roznyja padarki. Starajemsia zrabić heta jak najlepš, bo ŭ heny dzień i imianiny našaha ajca Dyrektara. Budzie tak-ža sarhanizavanaja jołačka i na pravasłaŭnyja Kalady. Prychodźcie i Vy da nas!

— Duža miła, duža dobra, što tak robicca, za takuju pracu budzie ŭdziačnaść dziciej, baćkoŭ i hramadzianstva. Ale mnie ŭžo para viartacca ŭ redakcyju. Dyk, byvajcie, chaj žyvuć, rastuć i raźvivajucca našyja maładyja Biełarusy!

— A nie zabudźciesia, kali łaska,—u dahon mnie kazali,— paprasić redaktara, kab jon zrabiŭ zaklik u hazecie da hramadzianstva, kab składała achviary na padtrymańnie niezamožnych biełaruskich vučniaŭ, bo pomač duža patrebnaja!

— I sapraŭdy, **pomač duža patrebnaja!**

*Reporter*

## *Hramadzianie!*

**Pamiatajcie ab biednaj biełaruskaj školnaj moładzi! Nadychodzie Śviata Božaha Naradžeńnia. Čakajem jaho z radaściaj. Ale małaja radaść tym, jakija nia majuć čaho ješci, u što abucca i apranucca. Da hetkich naležać mnohija z vučniaŭ biełaruskaj pačatkavaj školy i biełaruskaj prohimnazii ŭ Vilni**

**H r a m a d z i a n i e! Nie zabudźcie ab hetych patrabujučych, padarujcie im, što možacie, — hrošy, vopratku, abutak. Achviary pryjmaje redakcyja „Krynicy".**

---

začych, viadzie knihi, inventarnuju i kasavuju, kiruje ŭsiej majemaściaj Tavarystva, sklikaje zvyčajnyja i nadzvyčajnyja schody siabroŭ, vykonvaje ŭsiakija inšyja čynnaści, źviazanyja z dziejnaściu Tavarystva.

§ 38. Revizyjnuju Kamisiju ŭ składzie troch siabroŭ vybiraje na adzin hod Ahulny Schod. Da siabroŭ Revizyjnaj Kamisii tasujucca tyja samyja vymahańni, jak i da inšaha kiraŭnictva Tavarystva (§§ 8, 11 i 32 statutu). Siabrami Revizyjnaj Kamisii nia mohuć być siabry Upravy i płatnyja słužačyja Tavarystva. Dva razy ŭ hod, a ŭ patrebie i čaściej, Revizyjnaja Kamisija spraŭdžaje pierad usim dziejnaść Tavarystva, rachunkovaść i ab vynikach revizii paviedamlaje Ahulny Schod siabroŭ. Schody Revizyjnaj Kamisii sklikaje staršynia Revizyjnaj Kamisii Usie svaje pastanovy Revizyjnaja Kamisija pryjmaje zvyčajnaj bolšaściu hałasoŭ.

### VI. Spravazdača z dziejnaści Tavarystva i paradak paćvierdžańnia

§ 39. Kožny hod, nie paźniej jak u miesiacy studni, Uprava daje spravazdaču z svajej dziejnaści Ahulnamu Schodu, jaki razvažaje jaje, zasłuchaŭšy acenu Revizyjnaj Kamisii.

§ 40. Spravazdaŭčym hodam Tavarystva jość hod kalendarny.

§ 41. Kožny hod robicca preliminar dachodaŭ i vydatkaŭ. U Tavarystvie viadziecca kniha dachodaŭ, vydatkaŭ i majemaści.

§ 42. Spravazdača Tavarystva abviaščajecca publična da viedama ŭsich siabroŭ.

### VII. Kiravańnie majemaściaj Tavarystva i paradak jaho paćvierdžańnia

§ 43. Usieju majemaściu Tavarystva kiruje Uprava — pavodle hetaha statutu, pavodle instrukcyjaŭ Ahulnaha Schodu, pavodle zakonaŭ ab Tavarystvach („Vyr. Žin." Nr. 522) i pavodle dziejnych cyvilnych i inšych zakonaŭ. Kiravańnie majemaściaj praviaraje Revizyjnaja Kamisija i ab vynikach revizii paviedamlaje Ahulny Schod, jaki paćviardžaje henaje kiravańnie abo jaho adkidaje.

§ 45. Uprava pavinna viešci asobnu ju knihu majemaści Tavarystva.

### VIII. Srodki Tavarystva

§ 46. Srodki Tavarystva stanoviać: a) hadavyja siabroŭskija składki, b) achviary, c) pracenty ad kapitałaŭ, d) legaty, e) atrymanyja ad dziaržaŭnych i hramadzkich ustanovaŭ dapamohi i subsydyi, f) dachody z majemaści Tavarystva, g) z loteryjaŭ, zborkaŭ, z ładžanych hramadzkich imprezaŭ.

### IX. Paradak zakładańnia Addziełaŭ Tavarystva, kiravańnie imi i likvidacyja

§ 47. Tavarystva maje prava mieć addziely. Addziely možna zakładać na padstavie zhody Ministra Unutranych Spraŭ.

§ 48. U Addziele Tavarystva maje być nia mienš, jak 12 siabroŭ.

§ 49. Spravami Addziełu Tavarystva kiruje Ahulny Schod siabroŭ Addziełu, Uprava Addziełu i Revizyjnaja Kamisija. Pieršy Ahulny Schod Addziełu sklikaje paŭnamocnik Upravy Tavarystva.

§ 50. Da siabroŭ Addziełu Tavarystva, da Ahulnaha Schodu, da Upravy, da

## Biełaruski Addzieł Vajennaha Muzeju Vitaŭta Vialikaha

U Vajennym Muzeju imia Vitaŭta Vialikaha ŭ Kaŭnasie siarod roznarodnych pamiatak pałkoŭ i bataljonaŭ litoŭskaha vojska jość i asobny addzieł pamiatak biełaruskich vajskovych častak pry litoŭskim vojsku. U addziele znachodziacca fatahrafii, śpis zabitych i ranienych, śpis kavaleraŭ „Kryža Pahoni“, try partrety pałkoŭnika Łaŭrenćjeva, majora Ružancova, pałk. Uśpienskaha i inš. U kutku restaŭravany ściah biełaruskaha piešaha bataljonu. U vialikaj zali znachodziacca: pavialičany z fatahrafii abraz biełaruskaha švadronu i horadzienskaj kamendantury, adozvy na litoŭskaj i biełaruskaj movach.

U krypcie Muzeju bliska achviarnika na adnej z marmurovych došak załatymi litarami napisany darahija kožnamu Biełarusu imiony i proźviščy našych žaŭnieraŭ, zabitych u bajoch i pamioršych ad ran.

Litoŭski Narod, šanujučy pamiać hetych achviar, i acaniajučy ich hierojskija čyny na froncie, adzin iz „Zvanoŭ Baraćby“, na viežy Vajennaha Muzeju Vitaŭta Vialikaha, nazvaŭ imiem Biełaruskaha Žaŭniera.

## BIEŁARUSKAJA CHRONIKA

**Biełarusy ŭ Vilenskim Universytecie.** Pavodle apošniaj rejestracyi studentaŭ Vilenskaha Universytetu, Biełarusami zapisalisia 53 (piaćdziesiat try) asoby. Rejestracyja, jasnaja reč, nie achapiła značnaha liku studentaŭ Biełarusaŭ, jakija vyjechali z Vilni pierad prychodam siudy litoŭskaje ułady.

Jak daviedyvajemsia, mnohija z zarejestravanych studentaŭ Biełarusaŭ taksama pakidajuć Vilniu i vyjaždžajuć u Zachodniuju Biełaruś.

**„Хрысьціянства і Беларускі Народ“** — heta čarhovaja knižka niaŭtomnaha biełaruskaha dziejača i navukovaha pracaŭnika ksiandza Adama Stankieviča. Knižka hetymi dniami vyšła z druku. Farmat 8°. Bačyn 112. Nadrukavana hraždankaj. Knižka vydana ŭ češć 950-hodździa Chrostu Biełarusi, — i ŭ 25-tyja ŭhodki śviatarstva samaha aŭtara (28.XII. st. st. 1914 — 28.XII.39). Cana 2 lity. Recenziju na knižku damo paźniej.

**„XX Amžius“ ab Biełarusach.** Litoŭskaja, vielmi pavažnaja štodziennaja hazeta „XX Amžius“ („Dvaccaty Viek“) časta źmiaščaje infarmacyi ab Biełarusach, a 19 śniežnia u №291 znachodzim hutarku Staršyni Biełaruskaha Centru i dyrektara Bieł. Himnazii a. Adama Stankieviča z pradstaŭnikom hetaj hazety.

U hutarcy a. Ad. Stankievič pradstaviŭ žyćcio Biełarusaŭ u Litvie i jaho perspektyvy. Aproč hutarki, hazeta źmiaściła fotohrafiju hetaha našaha pierada voha dziejača.

**Staršynia Biełaruskaha Navukovaha T-va apiakunom Biełaruskaha Muzeju ŭ Vilni.** Načalnik na m. Vilniu i paviet daručyŭ staršyni Biełaruskaha Navukovaha T-va dr. Balesłavu Hrabinskamu vykonyvać apieku nad Biełaruskim Muzejam im. Ivana Łuckieviča ŭ Vilni i ŭparadkavać inventar, archiŭ i ŭsie eksponaty hetaha Muzeju.

**Jołka ŭ Biełaruskaj Himnazii.** Na Kućciu 24 h. m. vučniam Biełaruskaj Himnazii i Bieł. Pačatkavaj Škoły arhanizujecca jołka ŭ pamieškańni Himnazii, pry Daminikanskaj vul. 3/5. Pačatak a hadz. 11.

**Nastupny numar „Krynicy,“** z pryčyny kaladnich śviat, vyjdzie 29 śniežnia.

## Беларуская дэлегацыя ў Міністра Асьветы Латвіі

Міністра Асьветы Латвійскае рэспублікі, праф. Ю. Аўшкапа, адведала дэлегацыя Беларускага Таварыства ў Латвіі у складзе: старшыні т-ва—беларускага мастака Пётры Міраповіча і сябры праўленьня т-ва—сьвяшч. а. Міхала Краўчанкі. Дэлегацыя мела гутарку з Міністрам аб справах школьных, наагул, а асабліва аб справе Рыскай беларускай пачаткавай школы. Міністр прыняў дэлегацыю дужа прыхільна і абяцаў пайсьці на спатканьне ўсім культурна-асьветным патрэбам беларускае меншасьці і парадзіў, каб самі бацькі-Беларусы выяўлялі ініцыятыву і зьвярталіся з просьбамі аб беларускай мове ў школах на правінцыі. Захады дэлегацыі аб адчыненьні пры І-й Рыскай беларускай пачаткавай школе дашкольнага камплекту, які пры канцы мінулага навучальнага году Рыскім самаўрадам быў зьліквідаваны, міністр адразу-ж задаволіў і ў прысутнасьці дэлегацыі пазваніў па тэлефону гарадз. старшыні Рыгі, каб камплект быў адноўлены.

Проста ад міністра асьветы дэлегацыя накіравалася да гарадзкога старшыні гораду Рыгі, які адразу-ж прыняў дэлегацыю і паведаміў, што камплект будзе адчынены і няхай школа рэгіструе вучняў. І запраўды, праз два дні прыйшла афіцыяльная папера аб адчыненьні дашкольнага камплекту, які ўжо нармальна працуе.

З гэтага навучальнага прыкладу ясна відаць, што лёс беларускіх школ у Латвіі, а таксама і ў Літве, у значнай меры залежыць ад самых Беларусаў, ад іхняй сьвядомасьці і энэргіі ў шуканьні сваіх правоў. Трэба, каб беларускія бацькі ня толькі чакалі ды спадзяваліся на тое, што школы будуць, але каб самі дамагаліся школ, падаючы адпаведныя заявы і сьпісы вучняў. Трэба моцна памятаць, што „пад ляжачы камень і вада не цячэ“!

*Культасьветнік.*


**Uvaha!** **Uvaha!**

**Užo pryjmajecca padpiska na 1940 hod na najtaniejšuju ŭ Vilni hazetu**

# Krynica

„KRYNICA“ pačała vychodzić jašče ŭ Pietrahradzie ŭ 1917 h. i za svaju praŭdamoŭnaść była začyniana čužymi ŭładami až 3 razy.

Adnoŭlenaja „KRYNICA“ vychodzić dva razy ŭ tydzień i akramia daŭžejšych artykułaŭ na ŭsie biahučyja temy źmiaščaje zaŭsiody najnaviejšyja viestki z kraju i zahranicy.

**Padpisnaja płata na „Krynicu“ ŭ kraju**
razam z paštovaj pierasyłkaj
**— na hod 5 litaŭ, na paŭhoda 3 lity. —**
Padpiska dla zahranicy na hod dva amer. dalary.

HADAVYJA PADPIŠČYKI, JAKIJA APŁACIAĆ PADPISKU DA 1.IV. ATRYMAJUĆ CENNUJU PREMIJU.

Stałyja karespandenty karystajucca pry apłačvańni padpiski vialikimi palohkami.
Probnyja numary „Krynicy“ vysyłajucca darma pa atrymańni prośby i adresu.
**Pierasyłku hrašej treba adresavać hetak: Gudų laikraščio „Krynica“ administracijai, VILNIUS, Zavaline g-vė 1.**


Revizyjnaj Kamisii tasujucca adpaviednyja pastanovy hetaha statutu, jakija datyčać siabroŭ Tavarystva, Ahulnaha Schodu, Upravy i Revizyjnaj Kamisii.

§ 51. Usiu karespandencyju imiem Addziełu Tavarystva padpisvajuć staršynia Addziełu, ci jahony zastupnik, i sekratar.

§ 52. Apracа ahulnaj składki siabroŭ, Addzieły na svaich ahulnych schodach mohuć parupicca ab inšych srodkach na patreby svajho Addziełu, zhodna z vymohami hetaha Tavarystva i zakonu ab tavarystvach.

§ 53. Addzieły pracujuć pavodle statutu Tavarystva, pavodle instrukcyj Upravy i pavodle instrukcyjaŭ svajho Ahulnaha Schodu, jakija nie piarečać statutu Tavarystva.

§ 54. Ab začynieńni Addziełu Tavarystva pastanaŭlajuć: a) Ahulny Schod T-va zvyčajnaj bolšaściu hałasoŭ prysutnych, b) Ahulny Schod Addziełu bolšaściaj dvuch trecich hałasoŭ prysutnych siabroŭ na Schodzie.

§ 55. Pa začynieńni Addziełu Tavarystva ŭsia majemać jahonaja pierachodzie Tavarystvu.

§ 56. Addzieły Tavarystva mohuć mieć svaje piačatki, zaćvierdžanyja Ministram Unutranych Spraŭ.

### X. Paradak źmieny statutu

§ 57. Pytańnie ab źmienie statutu Tavarystva vyrašaje Ahulny Schod Tavarystva. Rašeńnie źmianić statut Tavarystva pryjmajecca bolšaściu nia mienš dvuch trecich prysutnych na schodzie siabroŭ. Statut Tavarystva moža być źmienieny tolki sa zhody Ministra Unutranych Spraŭ.

### XI. Likvidacyja Tavarystva

§ 58. Apracа vypadkaŭ praduhledžanych zakonami, Tavarystva jašče likvidujecca pastanovaj Ahulnaha Schodu. Na schodzie, na jakim pastanaŭlajecca likvidacyja Tavarystva, pavinna być prysutnaj pałavina ŭsich siabroŭ i rašeńnie heta pryjmajecca trymia čaćviertymi prysutnych siabroŭ.

§ 59. Likvidacyju Tavarystva Ahulny Schod daručaje Upravie abo specyjalnaj dziela hetaha vybranaj Likvidacyjnaj Kamisii. Pa likvidacyi Tavarystva, majemaść jahonaja pieradajecca analohičnamu biełaruskamu Tavarystvu.

*Vilnius, 194 ...... m. ...... m. ...... d.*
*Вільня, 194 г. м. д.*

**Gudų Veikimo Centrui Lietuvoje**
**Беларускаму Цэнтру ў Літве**

Pil. ..............................
Грам.

gyv. ..............................
праж. у

..............................

PAREIŠKIMAS — ЗАЯВА

Prašau priimti mane Gudų Veikimo Cen-
Прашу прыняць мяне ў сябры Беларускага

tro Lietuvoje nariu. Pasižadu pildyti organizacijos
Цэнтру ў Літве. Забавязваюся выпаўняць ста-

istatus ir nario pareigas.
тут арганізацыі і абавязкі сябра.

Esu Gudų tautybės, ...... mėtų amžiaus, Lietu
Я Беларус, маю ...... гадоў, зьяўляюся гра

vos pilietis.
мадзянінам Літвы.

Parašas ..............................
Подпіс

## Sučasnuju vajnu vyklikali siły, jakija prad 20-ciu hadami budavali Polšč

Na pasiedžańni Rady Fašysˉtoŭskich Korporacyj u Rymie dnia 16 h. m. italjanski ministr zahr. spraŭ hraf Čiano skazaŭ vialikuju palityčnuju pramovu ab zahraničnaj palitycy Italii ad 1935 h. i ab spravach sučasnych. Z pramovy hetaj daviedaŭsia šyroki śviet, što ab vajnie Niamieččyny z Polščaj było pastanoŭlena na niamiecka-italjanskaj naradzie ŭ Salzburgu 11-13 žniŭnia siol. Pastanova heta była adkazam na anhlicka-francuskija hvarancyi, jakija zaachvočvali Polšč da vajny z Niamieččynaj. Zahareŭsia pažar, pryčyn jakoha treba šukać u dalšaj minuŭščynie, kali paŭstavała Polšč i ŭ tych siłach, jakija Polšč budavali. Celyja hady havaryłasia ab tym, što Polšč, z uvahi na lik nasielnictva, heta vialikaja dziaržava. Vialikaja čaść hetaha nasielnictva adnak była nia polskaj, Palakoŭ-ža było tolki 18 miljonaŭ. Raźbiŭšy Polšč, Niamieččyna zajaviła, što nia maje pryčyny, dziela jakoj mieła-b dalej vajavać pročiŭ Zachadu. Adkazam na heta było žadańnie adbudavać nia tolki Polšč, ale Čechasłavaččynu i navat Aŭstryju, što jość roŭnaznačnym iz zračeńniem palityki nacyjanalizmu i jejnych pieramohaŭ. Niamieččyna pajšci na heta nie mahła.

Dalej, ministr Čiano zaŭvažyŭ, što Saviecki Sajuz, prad padpisańniem u žniŭni m-cy siol. historyčnaha paktu ab nienapadańni, uračysta mieŭsia być pryniaty ŭ kruh mižnarodnaj palityki „vialikich demokracyj." Ab rašeńni Niamieččyny adciahnuć Saviecki Sajuz ad Anhlii Italija daviedałasia tolki na pieradadni samoha padpisańnia henaha dahavoru ab nienapadańni. Ab pastanovie Italii z 1 vieraśnia siol. trymacca neŭtralna viedaŭ tolki niamiecki ŭrad. Italija, vyčerpanaja vajnoj u Afrycy i ŭ Hišpanii, na novuju vajnu moža rašycca tolki za try hady.

## Niemcy nia buduć adbudoŭvać Polščy

Z francuskich žarol pa viedamlajuć: Niamieččyna aficyjalna pryznaje, što nia dumaje adbudoŭvać polskaj dziaržavy choć-by i zusim małoj. Berlin pierakanany, što hienieralnaja polskaja hubernija heta akančalnaja dla polskich ziamiel administracyjnaja forma i budzie słužyć miescam asiadleńnia dla Palakoŭ i Žydoŭ. Stalicaj hubernii budzie Krakaŭ. Całaja hubernija budzie padzielena na čatyry vokruhi: Krakaŭski, Varšaŭski, Radamski i Lublinski. U Lublinskim vokruzie pradbačycca asiadleńnie najbolšaha liku Žydoŭ.

## Ministry adviedali Vilniu

U aŭtorak 18 h. m. cely dzień prabyvali ŭ Vilni staršynia Rady Ministraŭ A. Merkys i ministry: unutr. spraŭ K. Skučas, abarony — K. Musteikis, finansaŭ — Galvanaŭskas, justycyi—A. Tomašajtis i kamunikacyi – J. Masiliunas. Kožny z ministraŭ cikaviŭsia na miejscy svaim resortam, a staršynia Rady Ministraŭ pryjmaŭ akramia taho miascovych interesantaŭ.

## NA PALOCH FINLANDYI

Finy baroniacca ŭžo čaćviertyja tydzień. Savieckaja armija viadzie ciapier silnaje nastupleńnie papiaredžanaje ahniom artyleryi i ŭspamahanaje mnohaličnymi tankami. Jak dahetul adnak usie sproby pierałamać abaronnuju liniju Mannerheima, pavodle paviedamleńniaŭ finskich, byli adbity. Tolki na samaj poŭnačy savieckija addziely dajšli da hranicaŭ Norvehii. Apošnim časam na froncie prajaśniłasia pahoda, temperatura abnižyłasia da 30°C i ŭzmacniłasia akcyja vajennych samalotaŭ. Savieckija lotčyki kolki razoŭ rabili naloty na paŭdzionnuju i paŭdzionna-ŭschodniuju Finlandyju, abkidvajučy hetyja tereny bombami. Čynnyja byli i lotčyki finskija. Saviecki vajenny fłot padpłyvaŭ da bierahoŭ Finlandyi i abstrelivaŭ ich. Prybiarežnaja finskaja artyleryja taksama była čynnaja i zatapiła saviecki karabiel „Oktiabrskaja Revolucija", u 23.730 tonnaŭ.

## NIE CHAVAĆ ČUŽYCH LUDZIEJ

Rada Ministraŭ apracavała prajekt źmieny zakonu ab acharonie narodu i dziaržavy. Artykuł 23-ci hetaha zakonu budzie vyhladać hetak: „Chto chavaje abo pamahaje pierachoŭvać pierad orhanami litoŭskich uładaŭ čužynca, jaki ŭciok ci byŭ vysieleny z inšaha kraju ŭ Litvu, ci znajšoŭsia ŭ Litvie niejkim inšym sposabam, kali taki čužyniec: 1. budučy vajskovym vajujučaj dziaržavy byŭ internavany ŭ Litvie i z miesca internavańnia ŭciok, 2. zamaŭčaŭ prad litoŭskimi uładami, što jość vajskovym vajujučaj dziaržavy, 3. źjaŭlajecca hramadzianinam vajujučaj dziaržavy i nia maje prava na pobyt u Litvie, — toj karany budzie turmoj zvyčajnaj ci ciažkoj da 4-ch hadoŭ. Taksama karany budzie toj, chto pamahaje ŭciakać internavanaj asobie z łahieru internavanych".

**Akc. Strachavaja Supałka „KOOPERACYJA"**

zasnavanaja sajuzam kooperatyvaŭ i inšymi ahulnahaspadarskimi arhanizacyjami Litvy

**na vyhodnych varunkach strachuje:**

majemaść ad ahnia i inšych vypadkaŭ,
tavary transpartavanyja na suchapućci i na mory,
tavarnyja karabli i zmotaryzavanuju lokomocyju,
a taksama
tavarnyja karabli i transparty
ad vajennaha ryzyka.

Adres: KAUNAS, Laisvės Al. 39, Tel. 23 936, 25 804 i 24 334.
ADDZIEŁ: VILNIUS, Mickievičiaus g. 22—1, Tel. 373, 341.

**Šmalc biaz kartačak**

Akc. supałka ich pavaža- **„MAISTAS"** paviedamlaje svanych klijentaŭ što:

1. Usiakija tavary, z vyniatkam šmalcu, u kramach „MAISTASU" pradajucca **biaz nijakich ahraničeńniaŭ i biaz kartačak.**

2. Kali chto choča kupić u kramach „Maistasa" **tolki šmalec,** dyk toj pavinien mieć kartačku. Pa kartačcy moža atrymać 250 gr. šmalcu. Adnak, kali chto kuplaje ŭ kramach „Maistasa" **kaŭbasy** abo **valovinu,** toj moža atrymać (biaz kartačak) šmalcu na 20 prac. tej sumy, na jakuju kuplaje kaŭbasy ci valovinu. Kuplajučym samuju tolki śvininu, šmalc biaz kartačak nie pradajecca.

3. Na bačok kartački niepatrebnyja.

## Treciaja Žydoŭskaja Respublika

Za apošnija 20 hod Žydy duža staranna pracujuć nad zamacavańniem svajho stanovišča ŭ Palestynie. Z dapamohaj anhlickaha ŭradu i vojska, ciapier ličba Žydoŭ u Palestynie ŭzrasła blizu da 500.000 čałaviek, u toj čas, jak u 1920 hodzie ich va ŭsiej Palestynie naličvałasia tolki 50.000 čałaviek. Choć arabskaha žycharstva ŭ Palestynie naličvajecca bolš 1 miljona čałaviek, to Žydy spadziajucca, što jašče praz 5—10 hod žydoŭskaje žycharstva budzie nia tolki ŭ ekanamičnaj, ale i ŭ ličbovaj pieravazie nad Arabami.

Druhuju žydoŭskuju respubliku hadoŭ 15 nazad pačali budavać savieckija ŭłady ŭ Sybiry na race Amur. Hetaja žydoŭskaja respublika ŭžo maje svaju žydoŭskuju ŭładu i zaviecca Biro-Bidžanskaj respublikaj. Na terytoryju jaje emihrujuć Žydy z usiaho Savieckaha Sajuzu.

Treciuju žydoŭskuju respubliku ŭzialisia sioleta budavać Niemcy na specyjalnym ziamielnym abšary ŭ 100,000 kvadr. kilometraŭ, vydzielenym dla Žydoŭ na terytoryi byłoj Polščy naŭkoła horadu Lublinu. Siudy Niemcy źbirajuć Žydoŭ z usiaje Niamieččyny, Aŭstryi, Čechii, Moravii i Polščy, a miascovych žycharaŭ, Palakoŭ i Ukraincaŭ, Niemcy z Lublinščyny vysialajuć u inšyja miascovaści.

Lublin byŭ vybrany jak žydoŭski asiarodak tamu, što ŭ hetym horadzie ŭžo ŭ polskija časy była žydoŭskaja bolšaść, bo Žydy pačali tutaka sialicca až ad 14 stahodździa, a ŭ 1580 hodzie ŭ Lublinie navat stvaryŭsia žydoŭski parlament, u jaki pasyłali svaich pradstaŭnikoŭ Žydy z usiaje Polščy, a navat z Biełarusi i Litvy. Takim čynam historyčny Lublin, u jakim kaliści adbyvalisia ahulnyja Biełaruska-Litoŭska-Polskija sojmy i padpisana była viedamaja Lublinskaja vunija, — budzie ciapier stalicaju treciaje Žydoŭskaje respubliki. *Historyk*

*Купляйце*

Цана 50 цэнтаў без перасылкі

# VOKAM PA ŚVIECIE

**Straty Niamieččyny na mory.** Lik zatoplenych niamieckich karabloŭ uzrastaje i pa zataplenni krejsera „Columbus“ vyražajecca cyfraj 23. Usie jany, nia chočačy paddacca vorahu, sami siabie patapili. Ahulny tonaž hetych karabloŭ — 139.483 tonny. Aproč taho Anhlija i Francyja zatrymali 20 niamieckich karabloŭ ahulnaha tonažu da 100.000.

**U Finlandyi Ministar Abarony** zmabilizavaŭ mužčyn, narodžanych u 1899 h.

**U Słavaččynie** pry byŭšaj polska-słavackaj hranicy znachodzicca 500.000 čałaviek zhrupavanaha niamieckaha vojska. Kažuć, što Słavaččyna štoraz prychilniej adnosicca da Savieckaha Sajuzu.

**Ekspedycyjny korpus z Kanady pryjechaŭ u Anhliju.** Pavodle anhlickaj presy, Kanada daje pomač Anhlii ad pačatku vajny.

**U Ryzie** pamior doŭhaletni litoŭski dziejač, staršynia Litoŭskaha Tavarystva ŭ Łatvii i dyrektar litoŭskaj himnazii ŭ Ryzie, prałat D. Jasinskas.

**„Graf von Spee“** — samazatopleny niamiecki krejser zbudavany byŭ u 1934 h. Asnaŭnoje jahonaje ŭvaružeńnie: 14 harmat, 14 prociaeraplannych pryładaŭ, 10 kulamiotaŭ i 8 pryładaŭ dziela vystrelivańnia tarpedaŭ. Na karabli znachodzilisia dva samaloty. Absłuha składałasia z 926 asob. Kaštavaŭ hety krejser kala 70 miljonaŭ marak. Usia absłuha karabla „Graf von Spee“, ščaśliva ŭratavaŭšysia, intarnavanaja ŭ Arhientynie. Pavodle apošnich viestak, kamandant krejsera zastreliŭsia na razasłanym karabielnym ściahu.

**„Columbus“** — druhi vialiki niamiecki krejser zatrymany byŭ anhlickim krejseram tak-ža pry bierahoch Ameryki. Nia chočačy paddacca, kamandant zahadaŭ karabiel uzarvać. Absłuha karabla ŭciakła. Zabraŭ jaje adzin z amerykanskich karabloŭ i na padstavie zahadu prezydenta Ruzvelta internavaŭ na adnym z astravoŭ. „Columbus“ mieŭ zapas spažyvieckich praduktaŭ na 50 dzion i vioz dvaccać tysiač bočak karasiny.

Karabiel pabudavany u 1922 h. Tonaž—32 581.

**Papież** pierad Kaladami maje skazać pramovu, u jakoj pradstavić adnosiny Vatykanu da Niamieččyny i zakliča narody da miru.

**Na Zachadzie,** pa časovym supakoi, uzmahajucca bai.

**Na 60-yja ŭhodki Stalina** Hitler pierasłaŭ pryvitalnuju telehramu z pažadańniem Stalinu „ščaścia asabistana i ščaślivaj budučyni dla pryjacielskaha Sajuza Savieckich Respublik“.

**Polski emihrancki ŭrad abiacaje** „supracoŭnictva z narodami słavianskimi“ i „demokratyčnyja asnovy vybaraŭ.“

— **Try miljony** švedzkich karon sabrana ŭ Švecyi na pomač Finlandyi.

# Беларускі адрэсар м. Вільні

**1. Цэнтр Беларускага Руху ў Літве**—Вільня, Завальная 1. (Адрас для пісьмаў: Gudų Veikimo Centras Lietuvoje, Vilnius, Zavalinė g-vė 1). Пачне ўрадаваць у найбліжэйшым часе.

**2. Беларускі Музэй ім. Івана Луцкевіча,** Вільня, Астрабрамская 9. (Часова трудна даступны з прычыны цеснага памешканьня). Адчынены ў аўторкі і пятніцы ад 10 да 12 г.

**3. Беларуская Дзяржаўная Прогімназія,** Вільня, Дамініканская вул. 3|5. Канцэлярыя адчынена ад 8 да 12 гадз.

**4. Беларуская Дзяржаўная Пачаткавая Школа,** Вільня, Дамініканская вул. 3|5. Канцэлярыя адчынена ад 8 да 12 гадз.

**5. Беларускі Студэнцкі Саюз.** Існуе ад 1919 г. Часова нячынны з прычыны пераарганізацыі ўсяго унівэрсытэцкага жыцьця. Апошняе месца ўрадаваньня: Вільня, Завальная 1.

**6. Рэдакцыя і адміністрацыя часапісу «Крыніца,“** Вільня, Завальная 1., тэлеф. 28-32. (Адрас для пісьмаў: Gudų laikraščio „Krynica“ redakcija ir administracija, Vilnius, Zavalinė g-vė 1). Адчынена ад 10 да 14 гадз. Рэдактар прыймае ад 13—14 гадз.

**7. Беларуская кнігарня „ПАГОНЯ“.** Вільня, Завальная 1 (адрас для пісьмаў: Gudų knygynas „Pahonia,“ Vilnius, Zavalinė g-vė 1).

Адчынена ад 10 да 14 гадз.

**8. Беларуская кнігарня Ст-Станкевіча,** Вільня, Астрабрамская 2. (Gudų knygynas St. Stankevičiaus, Vilnius, Aušros Vartų g-vė 2).

**9. Беларуская друкарня ім. Д-ра Фр. Скарыны,** Вільня, Завальная 1, тэл. 28-32. (Адрас для пісьмаў: Gudų D-ro Skarynos vardo spaustuvė, Vilnius, Zavalinė g-vė 1). Адчынена ад 8 да 15 гадз. 30 мін.

**10 Беларусы праваслаўныя** асобнай для сябе царквы ў Вільні цяпер ня маюць.

**11. Беларусы-каталікі м. Вільні** ў кожную нядзелю і сьвята, апрача школьных фэрыяў, моляцца ў літоўскім касьцеле сьв. Мікалая (вул. сьв. Мікалая 8). Пачатак набажэнства роўна а гадз. 10.

**12. Беларускія радіоперадачы** з Віленскай радіостанцыі можна чуць у кожны аўторак а гадз. 19 мін. 30.


**Lietuvos LLOYDAS**

**Akc. Strachavoje T-va**

**Tavarystva strachuje:**

ad ahnia,
ad kradzieży z uzłomam,
ad raźbićcia šybaŭ,
transparty,
samachody (auto casco),
ad nieščaślivych vypadkaŭ
ad adkaznaści cyvilnaj,
na žyćcio.

URAD: Kaunas, L. Sapiegos g-ve 4c. Tel. 21381-85.
ADDZIEŁ: Vilnius, Gedimino 17 Telefony: 303 i 747.


# Žyćcio ŭ Vilni i Kraju

**Uradavy kamisarjat dla spraŭ uciekačoŭ** sarhanizavaŭsia ŭ Kaŭnasie pry Daukanto g-vė 13.

**Z abozaŭ dla internavanych** u Litvie majuć być chutka zvolnienyja tyja asoby, jakija dakažuć prava na svajo litoŭskaje hramadzianstva.

**Hien. Želihoŭskaha** majontak Andrajeva kala Turhielaŭ litoŭskija ŭłady zabrali i maniacca sarhanizavać u jom ziemlarobskuju školu. Majontak hety hien. želihoŭski atrymaŭ u svaim časie za toje, što dałučyŭ u 1920 h. Vilniu da Polščy.

**Sajuz litoŭskich piśmieńnikaŭ** u Vilni pasialiŭsia ŭ novym pamieškańni b. Apelacyjnaha Sudu pry Łukišskim placy.

**Apieka nad matkaju i dziciam** sarhanizavała ŭ Vilni niekalki punktaŭ, jakija razdajuć dzieciam małako i inšyja pradukty, tam-ža jak dzieci tak i matki karystajuć z lekarskaj pomačy.

**„Marginiai“** na miescy „Bazaru Przemysłu Ludovego“ užo adčyniŭ svaju kramu pry Zamkovaj vul. 8, dzie i pradaje usiakija vyraby samadziełu. Darečy, „Marginiai“ palitoŭsku abaznačaje uzorystuju tkaninu, a samo tavarystva „Marginiai“ jošć tavarystvam kooperatyŭnym. Papiaredni „Bazar“ (krama i skład) źlikvidavany.

**Pierarehistracyja.** Pavodle apošniaha zahadu vajennaha kamandanta m. Vilni usie byłyja pracaŭniki polskaj palicyi, vajskovyja i siabry vajskovych arhanizacyj, kali jany znachodziacca na abšary m. Vilni i pavietu, a pachodziać z abšaraŭ nieŭvajšoŭšych u skład Litvy, pavinny zarehistravacca ŭ najbližejšaj palicejskaj kamandzie najpaźniej da 31 śniežnia. Palicyjanty i vajskovyja z abšaraŭ Litvy pavinny zarehistravacca tam-ža da dnia 20 studnia 1940 h.

**PADPISKU NA „KRYNICU“ Z ZAHRAHICY možna pierasyłać u piśmach mižnarodnymi paštovymi kuponami, jakija možna atrymać na kožnaj pošcie.**

**Akružny Sud u Vilni,** jak pieršaja i jak druhaja instancyja, pačnie pracavać pa Novym Hodzie.

**Zahad ab vyvieskach i reklamach** užo padpisaŭ burmistr Vilni K. Stašys. Zahad hety u najchutčejšym časie budzie abjaŭleny.

**Balnica Lit. Čyrvonaha Kryža** zasavana na miescy kliniki Universyteckaj.

**Z Vilenskaha Samaŭradu.** Namieśnikam burmistra m. Vilni naznačany užo i pryjechaŭ u Vilniu A. Pimpe.

**Prymusovaja strachoŭka** zaviedzienaja ŭ nas pry polskaj uładzie ad 1.I.1940 h. kasujecca. Kažny damaŭłaśnik moža ciapier strachavać svaju majemaść u jakim choča strachovym t-vie. Sprava prymusovaj strachoŭki sielskich haspadarak vyjaśniajecca.

**Praz całuju noč** možna budzie chadzić u Vilni na kućciu prad pieršym dniom Kaladaŭ (24—25.XII) i prad Novym hodam.

**Pracaŭnikami mahistratu** Vilenskaha ad Novaha hodu mohuć być tolki asoby, jakija majuć litoŭskaje hramadzianstva.

**Jołki na Kalady** mohuć być, tolki nia možna na heta vysiakać lesu sadžanaha. Hetym samym kasujecca papiaredniaja viestka ab tym, što jołak sioleta nia budzie naahuł.

**Novyja aŭtobusy ŭ Vilni.** Ad Novaha Hodu ŭ Vilni buduć jeździć novyja aŭtobusy, zamiest dasiulešnich — „arbonaŭ“. Ich budzie 20 štuk. Cana biletaŭ za prajezd astajecca taja samaja.

**Kaladnija feryi** ŭ školach pačalisia 22 śniežnia i tryvać buduć u pačatkavych školach da 3, a ŭ siarednich da 8 studnia 1940h.

**Koni dla sialan** adstupaje vojska pa canie ad 50 da 100 litaŭ. Padrobnaści ŭ hminach.

# Naša pošta

**Saŭlevič D. u Łatvii:** Vaša ajčyna astałasia ŭ Savieckaj Biełarusi. Pastarajciesia prysłać padpisku. Ab sposabie daviedajeciesia iz źmieščanaj u papiarednim i ŭ hetym numary „Krynicy“ abviestki. Trymajciesia i šukajcie ziemlakoŭ.

**Gr. E. Kasperovič. Asyž, Italija.** I nam pryjemna, što „Krynica“ spaŭniaje svaju rol miž Biełarusami na čužynie. Mo' znajecie kaho bolš u svaich staronach, kab i im pasłać „Krynicu.“ Paviedamiecie i ab nas nie zabyvajciesia.

**Dr. J. G., Praha.** Atrymali, žadanaja „Pahonia“ budzie vysłana, tolki kali jana dojdzie ŭ siańniašnija časy?

**Laśniku, Łavaryški.** Z vašaj karespandencyi pryšłosia toje miesca ab radiopieradačach z Vilni vypuścić. Za uvahu ab megafonach dziakujem. Zhadžajemsia, što na pačatak jošć užo i mohuć jašče być bolej usiudy roznyja niedachopy, treba ich ciarplіva pieramahać, a hałoŭnaje — mieć dobruju volu. Jak byvajecie ŭ Vilni, zajdzieciesia ŭ redakcyju, vyjaśnim dalšyja spravy.

**Dz. Ilukoviču D.** Ab sposabie zasnavańnia biełaruskaj školy pisała „Krynica“, № 10. Tam-ža padadzieny ŭzor śpisu dziaciej u školnym vieku. Źviarniecie ŭvahu na pajaśnieńnie ab dziacioch 1-ha addziełu na vioscy: jany nie zaličajucca da ahulnaha liku, patrebnaha dziela adčynieńnia školy.

**Batraku spad Trokaŭ.** Cana na dreva ŭ Vilni—rynačnaja. Kali ad kaho dreva ŭziali z rynku siłkom, dyk chiba byli dahadki, što jano pachodzić nia z sobskaha lesu, ci niešta padobnaje. Za hazetu apłačana na paŭhodu.

## ACHVIARY

**na biednych dziaciej biełaruskich škoł u Vilni, złožanyja ŭ redakcyi „Krynica“**

Ks. Ad. Stankievič 5 lit., Vasil Kavalevič 5 lit., A. Karniuk 2 lit., A. Lekant 3 lit., A. Jegier 3 lt., Z. Novik 1 lt., a. A. Koŭš 3 lt., Dr. Hrabinski 2 lt., M. Škialonak 1 lt., St. Miadoŭski 1 lt., Archim. Savvacij 1 lt. (d. b.)

## Piśmo ŭ Redakcyju

**Do Pana Redaktora „Krynicy“**
w Wilnie ul. Zawalna 1. m. 2

W numerze 2 „Krynicy“ z dnia 21 listopada 1939 r. ukazał się artykuł „Spalili historyju Vilenskaj Biełaruskaj Himnazii“, w którym zostałem zaatakowany zupełnie niesłusznie.

Proszę uprzejmie o umieszczenie w jednym z najbliższych numerów swego cennego pisma następującego sprostowania:

Nieprawdą jest, że protokóły Rady Pedagogicznej Wileńskiego Białoruskiego Gimnazjum poczynając od roku 1919 do dni ostatnich kazał spalić żerebecki, dyrektor polskiego gimnazjum im. A. Mickiewicza w Wilnie.

Natomiast prawdą jest, że zakomunikowałem kierownikowi Filii Białoruskiej polecenie władz szkolnych spalenia aktów mobilizacyjnych i aktów tajnych. Polecenie takie otrzymały wszystkie urzędy i szkoły. Protokułów Rady Pedagogicznej nie zalicza się ani do aktów mobilizacyjnych ani do aktów tajnych.

Jeżeli oprócz wspomnianych aktów zostało w Gimnazjum Białoruskim cokolwiek spalone, ani ja, ani byłe władze szkolne nie mają z tym nic wspólnego.

Informacji, co i dlaczego spalono, mógłby udzielić tylko ten, który to uczynił.

Z poważaniem **Żerebecki Zdzisław**
W Wilnie, dnia 16 grudnia 1939.

**Ad Redakcyi:** Achvotna źmiaščajučy heta vyjaśnieńnie nia možam nia vykazać ździŭleńnia, čamu dyrektar žerebecki pierachoŭvaŭ ci dapuskaŭ pierachoŭvańnie ŭ Biełaruskaj Filii dziarž. himnazii „aktów mobilizacyjnych i aktów tajnych“? Jakuju-ž tady rol mieła spaŭniać škoła daručanaja dyrektaru žerebeckamu?

Leidėjas ir Redaktorius: ADOLFAS KLIMAVIČIUS
Vydaviec i Redaktar: ADOLF KLIMOVIČ
Telefon u drukarniu i redakcyju 28-32.
Fr. Skarinos vardo Gudų Spaustuvė, Vilnius, Pylimo g-vė 1.
Biel. Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, vul. Zavalnaja 1.